УДК 334.73 (476-15) (091) «1932/1936»

*А.Л. Радзюк*

# ДА ГІСТОРЫІ «МАЛАЧАРСКАГА ТАВАРЫСТВА» Ў БАРАНАВІЧАХ (1932–1936 гг.)

У прадстаўленым артыкуле ўпершыню даследуюцца асноўныя этапы развіцця і дзейнасці «Малачарскага таварыства» ў Баранавічах. На аснове аналізу архіўных дакументаў, успамінаў удзельнікаў арганізацыі, а таксама матэрыялаў перыядычных выданняў 1930-х гг. даецца апісанне асноўных накірункаў гаспадарчага жыцця таварыства і ўмоў яго існавання. Акрамя таго, праводзіцца кароткі аналіз агульнага стану развіцця малочнай кааперацыі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, робіцца характарыстыка заканадаўчай базы дзейнасці «Малачарскага таварыства» ў Баранавічах. Аўтар прыходзіць да высновы, што, нягледзячы на ціск з боку польскай адміністрацыі і складаныя эканамічныя ўмовы існавання, таварыства не толькі дасягнула некаторых гаспадарчых поспехаў, але і адыгрывала прыкметную ролю ў жыцці насельніцтва свайго рэгіёна.

## Уводзіны

Пытанні, звязаныя з дзейнасцю беларускіх кааператыўных арганізацый на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў міжваенны перыяд, зрэдку траплялі ў цэнтр увагі гісторыкаў. Большасць навукоўцаў закраналі адзначаную тэматыку выключна ў рамках рэалізацыі іншых даследчыцкіх задач. Толькі ў аснобных працах рабіліся спробы даць агульную характарыстыку кааператыўнаму руху, высветліць чаму ў гэтай галіне гаспадарчага жыцця беларусы не дасягнулі значных поспехаў [1–3]. Аднак на сённяшні дзень у гістарыяграфіі не існуе даследаванняў дзейнасці асобных кааператываў ці нават формаў кааперацыі (вытворчай, спажывецкай, крэдытнай і інш.) у Заходняй Беларусі, што значна ўскладняе комплексны аналіз усяго беларускага кааператыўнага руху.

Адным з аспектаў гаспадарчай гісторыі краю, які патрабуе больш уважлівага разгляду, з'яўляецца малочная кааперацыя. У манаграфіях польскіх даследчыкаў В. Арміцкага [4] і У. Русіньскага [5] можна знайсці некаторыя статыстычныя дадзеныя, датычныя яе развіцця на тэрыторыі чатырох паўночна-ўсходніх ваяводстваў. Але гэтыя звесткі не носяць сістэмнага характару і не даюць магчымасці прасачыць спецыфіку ўмоў існавання малачарняў. Акрамя таго, яны не дазваляюць ахарактарызаваць канкрэтныя кааператывы з пункту гледжання ролі беларускага насельніцтва ў іх кіраванні і дзейнасці. Між тым для айчыннай гістарычнай навукі вельмі важным з'яўляецца паказ эканамічнай самадзейнасці і гаспадарчай ініцыятыўнасці беларусаў. У гэтым плане адным з самых яскравых прыкладаў з'яўляецца дзейнасць ў Баранавічах «Малачарскага таварыства», якое дасягнула значных поспехаў, нягледзячы на разнастайныя перашкоды. Дадзеная работа мае на мэце асвятліць гісторыю ўзнікнення і дзейнасці таварыства, а таксама ўмовы яго функцыянавання.

## Утварэнне і дзейнасць «Малачарскага таварыства» ў Баранавічах

Малочная кааперацыя ў Заходняй Беларусі пачала развівацца толькі з 1925 г. Менавіта тады польскі ўрад пачаў праводзіць палітыку падтрымкі дадзенай формы кааперацыі праз выдзяленне танных крэдытаў, што, ў сваю чаргу, стымулявала арганізацыйную актыўнасць польскіх рэвізійных саюзаў на тэрыторыі краю [6, с. 81; 7, л. 43]. Дзякуючы гэтаму ужо праз год пачалі сваю працу 11 малачарняў, а ў 1929 г. толькі на тэрыторыі Віленскага і Навагрудскага ваяводства існавала 140 малочных кааператываў [4, s. 163; 6, с. 81]. Разам з тым многія з новастворaных малачарняў не мелі пад сабой трывалага грунту: трымаліся выключна на дзяржаўнай падтрымцы, не карысталіся даверам мясцовага насельніцтва. Таму эканамічны крызіс, які неўзабаве ўспыхнуў і моцна адбіўся на коштах малочных вырабаў, прывёў ў 1933 г.да скарачэння коль-

касці малачарняў на 35% [6, с. 81]. Акрамя таго многія кааператывы знаходзіліся на мяжы ліквідацыі і працягвалі існаваць толькі па прычыне прапісанай у статуце матэрыяльнай адказнасці сяброў [7, л. 43]. Важнай праблемай з'яўлялася і тое, што мясцовы беларускі селянін не прымаў ніякага ўдзелу ў кіраванні гэтымі кааператывамі, не лічыў іх сваімі, а, хутчэй, разглядаў умоўную малачарню толькі як месца збыту лішкаў малака. Таму відавочнай была патрэба пэўнай беларусізацыі малочнай кааперацыі Заходняй Беларусі. У канцы 1920-х гг. падобныя заклікі пачалі гучаць са старонак беларускай прэсы. Так, рэдактар часопіса «Саха» У. Павалковіч казаў, што без увядзення ў кааперацыю беларускага элемента не можа быць і гаворкі аб падняцці ўзроўню гаспадарчага жыцця краю [8, с. 2]. Але польскія ўлады не жадалі падтрымліваць і тым больш ствараць беларускія кааператывы (у тым ліку малачарні). Так, у дакуменце МУС Польшчы пачатку 1930-х гг. аб задачах у сферы гаспадарчага жыцця «крэсаў» разам з патрабаваннем апекі над малочнай кааперацыяй, падкрэсліваецца неабходнасць недапушчэння заснавання беларускіх кааператываў [9, л. 23].

Значнай праблемай на шляху развіцця беларускай малочнай кааперацыі была і адсутнасць у нацыянальным руху сілаў, здольных падтрымаць гэтае пачынанне: забяспечыць яго неабходнымі кадрамі і аказаць матэрыяльную падтрымку. Фактычна адзінай арганізацыяй, якая ў канцы 1920-х – пачатку 1930-х гг. мела рэсурсы для пашырэння малачарства на этнічных беларускіх землях, была Камуністычная партыя Заходняй Беларусі (КПЗБ). Але ў 1929 г. яна ўзяла курс на пашырэнне выключна спажывецкіх кааператываў [10, л. 28]. Такім чынам, атрымоўвалася, што беларуская малачарня магла пачаць працу выключна дзякуючы актыўнасці мясцовых энтузіястаў-кааператараў і высокаму ўзроўню салідарнасці беларускіх сялян канкрэтнай вёскі. Акурат так і зараджалася «Малачарскае таварыства» ў Баранавічах. Яно з'явілася як бы насуперак тагачасным эканамічным і палітычным умовам.

Ядром будучага таварыства стала малачарня ў вёсцы Вялікая Ліпа Нясвіжскага павета. Яна была заснавана ў 1929 г. у выніку аддзялення сяброў-ліпаўцаў ад польскай малачарні, якая знаходзілася ў суседняй вёсцы Круты Бераг. Сялян з в. Вялікая Ліпа не задавальняла праца гэтага кааператыва. На пачатку 1929 г. адбыўся арганізацыйны сход новай малачарні ў ліку 25 сяброў, а ў хуткім часе яна была ўнесена ў рэестр Акружным судом у Навагрудку. Нягледзячы на некаторыя перашкоды з боку польскіх ураднікаў, кааператыў пачаў даволі паспяхова развівацца. З мая 1929 г. па студзень 1930 г. яе абарот склаў каля 20 тыс. злотых, было перапрацавана 83 569,5 літраў малака і выраблена 3 673 кг масла [11, с. 32–33].

Да 1932 г. у рэгіёне ўзнікла яшчэ некалькі меншых малачарняў (у вёсках Аношкі, Грузкава, а ў Лісіцах Нясвіжскага павету яшчэ ў 1928 г.), ініцыятыва ў адкрыцці якіх належала беларускім дзеячам. Усе яны не былі членамі польскіх рэвізійных саюзаў, што не толькі значна абцяжарвала іх дзейнасць ў атрыманні крэдытаў і пры падаткаабкладанні, але і стварала цяжкасці з рэалізацыяй прадукцыі [12, л. 20–23]. Каб неяк зняць праблему збыту, беларускія малачарні вырашылі аб'яднацца ў таварыства.

31 мая 1932 г. быў праведзены арганізацыйны сход будучага таварыства, на якім прысутнічалі па два прадстаўнікі ад кожнага з беларускіх малочных кааператываў (М. Саўка і У. Ярашчук ад в. Вялікая Ліпа, К. Мікула і М. Хоміч – ад в. Аношкі, М. Мікітка і Т. Рэчка – ад в. Грузкова, В. Кобусь і У. Абрамовіч – ад в. Лісіцы). Была выбрана наглядная рада ў колькасці 6 чалавек, якая ў сваю чаргу вызначыла склад дырэкцыі (ўрада) кааператыва: М. Гузоўскі, М. Саўка і К. Мікула [13, л. 1–4]. На гэтым жа сходзе быў прыняты статут установы. Паводле § 3, таварыства абвяшчалася «аб'яднаннем кааператываў сельскай прадукцыі на кааператыўных прынцыпах, якое займаецца падтрымкай задач і дзейнасці сялянскай кааперацыі, звязанай са збытам надояў і іншых сельскагаспадарчых прадуктаў» [13, л. 2].

Першай пастановай дырэкцыі новага таварыства стала рашэнне адкрыць краму для продажу масла ў г. Баранавічы. (Першапачаткова назва арганізацыі была «Малачарскае таварыства ў В. Ліпе», але пасля адкрыцця крамы ў Баранавічах менавіта туды было перанесена кіраўніцтва кааператывам. Відавочна, з эканамічнага пункту гледжання гэта было больш мэтазгодна. На агульным сходзе 1934 г. такія змены былі замацаваны юрыдычна ў выглядзе новай назвы – «Малачарскае таварытсва ў Баранавічах» [13, л. 7]).

У першы (1932 г.) няпоўны год працы агульны абарот быў нязначны – 32 тыс. злотых, што стала прамым наступствам эканамічнага крызісу; таварыства працавала з невялікімі стратамі [13, л. 3, 9].

Ужо ў наступным годзе ў дырэкцыі «Малачарскага таварыства» адбыліся прынцыповыя змены: на пасаду дырэктара заступіў П. Орса – выпускнік Пражскай політэхнікі (спецыяльнасць «аграном малачарства»), свядомы беларус і выбітны кааператар [14]. У яго асобе таварыства атрымала добра падрыхтаванага і энергічнага кіраўніка, які значна рацыяналізаваў дзейнасць арганізацыі і не дапусціў яе занядбання ў цяжкія часы.

На пачатку 1933 г. у таварыства была прынятая яшчэ адна новая малачарня – з в. Вялікае Падлессе [12, л. 21]. Ужо ў гэтым годзе аб'яднанне пачало працаваць з неблагім даходам – 882 злотых, а гадавы абарот дасягнуў амаль 64 тыс. злотых [13, л. 9]. Галоўным чынам «Малачарскага таварыства» займалася тым, што купляла масла ў падначаленых малачарняў з наступным яго продажам войску, спажывецкім кааператывам, а трохі пазней нават пастаўляла яго ў г. Лодзь. Продаж масла складаў 90% ад усяго абароту. Акрамя гэтага таварыства займалася купляй-продажам галандскіх сыроў, яек, мёду, яблыкаў і печыва [13, л. 8–9; 14].

Два работнікі кааператыву атрымоўвалі «пенсіі»: дырэктар – 100 злотых + 1% ад абароту і крамнік – 50 злотых [13, л. 8]. Праца была вельмі цяжкая. Жонка П. Орсы, якая кіравала крамай, узгадвала: «Вы знаеце, як мы працавалі? Па 18 гадзін у дзень. Трэба было краму глядзець, каб чыста было. Улетку муж паедзе па вёсках, а я застаюся адна. А тут – чатыры гадзіны раніцы, і воз за возам вязуць масла ў глыбах па чатыры кілі. І што рабіць? У нас ляднік быў. Я брала малаток, сякеру і запакоўвала тавар» [14].

Рэгулярная карэспандэнцыя ад прадстаўнікоў Баранавіцкай малачарні ў часопіс «Самапомач» (рэдактар А. Клімовіч) указвае на тое, што лідэры таварыства былі ідэалагічна блізкія да Беларускай хрысціянскай дэмакратыі (БХД). (Пазней у сваіх успамінах А. Клімовіч вельмі пазітыўна ацэньваў дзейнасць таварыства і асабліва вылучаў двух працаўнікоў: М. Саўку і П. Орсу [16, л. 5–6]). Восенню 1933 г. таварыства прыняло ўдзел у кааператыўнай нарадзе ў Вільні, зладжанай БХД. На ёй прысутнічаў адзін з лідэраў Украінскага нацыянальна-дэмакратычнага аб'яднання (УНДО) А. Луцкі [15]. Згаданая партыя займала вядучыя пазіцыі ў моцным украінскім кааператыўным руху. Такая сустрэча дазволіла прадстаўнікам таварыства наладзіць кантакты з украінскім «Масласаюзам» – адным з вядучых аб'яднанняў у сферы малочнай кааперацыі ва ўсёй тагачаснай Польшчы (дастаткова сказаць, што ў 1929 г. экспарт яго масла складаў 7% ад ўсяго экспарту масла Польшчы [17, s. 77]). Супрацоўніцтва з «Масласаюзам» і ўступленне ў яго склад магло б даць Баранавіцкаму таварыству значныя выгоды: танны крэдыт і новыя рынкі збыту, большая незалежнасць ад польскіх рэвізійных саюзаў і ўвогуле польскіх уплываў. Але новае кааператыўнае заканадаўства Польшчы, прынятае ў 1934 г., рабіла гэтыя перспектывы нерэальнымі. Адзіным плюсам ад супрацоўніцтва з украінскімі малачарнямі стала магчымасць купляць зімой масла ў Галічыне, калі свайго было зусім мала.

Паводле новага кааператыўнага закона, «Малачарскае таварыства» было абавязана на працягу 2 гадоў далучыцца да пэўнага Рэвізійнага саюзу (правам рэвізіі на беларускіх землях валодалі толькі польскія саюзы) [18]. Падобная дэкларацыя была складзена на агульным сходзе 13 сакавіка 1934 г., а ў 1934–1935 гг. у рэвізійны саюз усту-

пілі асобныя малачарні [13, л. 7; 12, л. 20–24]. Трохі пазней ва ўправе таварыства адбылася першая рэвізія, якая не выявіла значных хібаў у яго дзейнасці. Адзіная прапанова, якую выказаў рэвізор Кааператыўнай рады С. Краўзе, – павысіць паі [13, л. 8–12]. Ужо на наступным сходзе яна была ўлічана: пай быў узняты адразу ў 5 разоў без уліку інфляцыі. Шмат у чым дзякуючы гэтаму гадавы абарот узрос да 80 тыс. злотых [13, л. 15].

Мясцовыя ўлады ставіліся да беларускага таварыства непрыхільна: ускладнялі атрыманне крэдыту, адгаворвалі кліентаў. Але да пэўнага часу прамых атак на арганізацыю не было, бо яна была не палітызаваная і мела выключна гаспадарчы характар. Пры гэтым сябры таварыства, яго кіраўніцтва выразна выяўлялі сваю нацыянальную ідэнтычнасць: камунікацыя ўнутры арганізацыі і сходы праходзілі толькі па-беларуску [19].

За першыя 10 месяцаў 1936 г. ў параўнанні з мінулым годам таваравзарот «Малачарскага таварыства» вырас у два разы. Але гэта не дапамагло ўратаваць таварыства ад канфлікту з польскім рэвізійным саюзам, які, карыстаючыся новым заканадаўствам, аказваў на арганізацыю яго значны ціск. Так, пад пагрозай ліквідацыі існуючых таварыству не дазвалялася адчыняць новыя малачарні. На прадукцыю беларускай малачарні накладаліся дадатковыя падаткі, таму беларусы нават вымушаны былі скласці скаргу да «Izby Rolniczej» [13, л. 34]. Справа ў тым, што 22 красавіка 1936 г. пачаў дзейнічаць новы малачарскі закон. Паводле яго новыя пляцоўкі маглі стварацца толькі са згоды «Izby Rolniczej», а стар ыя мусілі атрымаць яе дазвол. Такім чынам, «Izba Rolnicza» станавілася галоўнай кантралюючай інстанцыяй для малочных кааператываў [17, s. 79]. Трохі пазней саюз адчыніў у Баранавічах новую больш палітычна «нейтральную» краму для продажу масла [20].

Аднак далейшае існаванне беларускага таварыства паступова рабілася немагчымым: па-першае, з-за паввшэння канкурэнцыі, а-другое, з-за спецыфікі новага заканадаўства ў сферы малочнай кааперацыі, згодна з якім уся тэрыторыя Польшчы была падзелена на раёны, і на тэрыторыі кожнага такога раёна магло дзейнічаць толькі адно малачарскае аб’яднанне. Паколькі канкурэнтам «Малачарскага таварыства» ў рэгіёне быў буйны агульнапольскі малочна-яйкавы саюз, то разлічваць на працяг дазволу на дзейнасць ад «Izby Rolniczej» фактычна было нерэальна. Таму 8 лістапада 1936 г. на агульным сходзе было прынята рашэнне ліквідаваць «Малачарскае таварыства» ў Баранавічах. Па просьбе прадстаўнікоў найбуйнейшых кааператываў з вёсак Аношкі, Вялікае Падлессе і Вялікая Ліпа запасны капітал у памеры 3 тыс. злотых быў падзелены. Малачарня ў Вялікім Падлессі атрымала 1 000 зл. на закупку машын, а прадстаўнікі малачарняў у Аношках і Вялікай Ліпе аналагічную суму накіравалі на будоўлю і рамонт сваіх гаспадарчых памяшканняў. Пасля правядзення ў 1937 г. апошняй рэвізіі і выканання ўсіх ліквідацыйных абавязкаў у лістападзе 1938 г. таварыства перастала існаваць [13, л. 42–44, 48].

**Заключэнне**

Такім чынам, гісторыя дзейнасці Баранавіцкага малачарскага таварыства шмат у чым паказальная як ілюстрацыя тагачасных рэалій існавання беларускіх гаспадарчых установаў. Не маючы значнай падтрымкі звонку, сябры малачарскага аб’яднання вымушаныя былі разлічваць выключна на ўласныя сілы. Пры гэтым яны прадэманстравалі вялікае імкненне да творчай і энергічнай працы на ніве кааператыўнага будаўніцтва, не зважаючы нават на цяжкія ўмовы існавання: эканамічны крызіс і фарміраванне недэмакратычнага кааператыўнага права ў Польшчы. Але ў другой палове 1930-х гг. пачаўся наступ польскага ўраду на ўсе беларускія кааператывы, што прывяло да ліквідацыі таварыства. Між тым яно заняло сваё месца ў гісторыі краю як прыклад добра наладжанай і даволі паспяховай гаспадарчай арганізацыі, у якой беларусы паказалі і рэалізавалі свой патэнцыял да эканамічнай работы ў сферы кааперацыі.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ


1. Gomółka, K. Białoruskie instytucje życia gospodarczego w II Rzeczypospolitej / K. Gomółka // Białoruskie Zeszyty Historyczne. – 1997. – № 8. – S. 90–98.

2. Міранові, Я. // Нацыянальныя пытанні : матэрыялы III Міжнар. кангрэса беларусістаў «Беларуская культура ў дыялогу цывілізацый» (Мінск, 21–25 мая, 4–7 снеж. 2000 г.) / Я. Миранович / рэдкал.: Э. Дубянецкі (гал. рэд.) і інш. – Мінск : «Беларус. кнігазбор», 2001. – С. 137–141.

3. Wysocki, R. Spółdzielczość białoruska na terenie województwa Białostockiego w latach 1919–1939 / R. Wysocki // Białostocczyzna. – 1996. – № 1. – S. 39–47.

4. Ormicki, W. Życie gospodarcze kresów wshodnich Rzeczypospolitej Polskiej / W. Ormicki. – Kraków : «Orbis», 1929. – 308 s.

5. Rusiński, W. Zarys historii polskiego ruchu spółdzielczego / W. Rusiński. – Warszawa : CRS, 1967. – Część II: 1918–1939. – 338 s.

6. Małačarstwa na ziemliach Zach. Biełarusi // Самапомач. – 1935. – № 11. – С. 80–82.

7. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці (ДАБВ). – Фонд 1. – Воп. 9. – Спр. 46.

8. Неабходнасць уласных гаспадарчых установаў // Саха. – 1928. – Сак.-крас. – С. 1–3.

9. Архіў новых актаў у Варшаве (АНА). – Фонд 9, дадатак. – Адзел заходні 1073.

10. АНА. – Фонд 9, дадатак. – Адзел заходні 961.

11. Як арганізавалася коопэратыўная малачарня ў Вялікай Ліпе Нясьвіскага павету // Самапомач. – 1933. – № 4. – С. 32–33.

12. АНА. – Фонд 213. Каапературыўная рада. – Адзел заходні 49.

13. АНА. – Фонд 213. Каапературыўная рада. – Адзел заходні 595.

14. Баранавіцкая малачарня: да гісторыі каапэратыўнага руху ў Заходняй Беларусі і беларуска-польскіх дачыненьняў. Інтэрв'ю зь Пятром Орсам // Беларус. – 1993. – № 399. – С. 6.

15. Баравізна, Я. Наш вывад / Я. Баравізна // Беларуская Газэта – 1933. – 30 верас. – С. 2.

16. Клімовіч, А. Да гісторыі беларускай коопэрацыі / А. Клімовіч // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАНБ). – Фонд 5 «Клімовіч Адольф Юстынавіч». – Воп. 1. – Спр. 7.

17. Filar, T. Ukraiński ruch spółdzielczy w II Rzeczypospolitej i polityka wobec niego władz polskich / T. Filar // Zeszyty Nawkowe Akademii Ekonomicynej w Krakowe. – 2000. – № 548. – S. 75–81.

18. Dziennik Ustaw Rzeczyposporolitej Polskiej. – № 38. – Poz. 342. – Ustawa z dnia 13 marca1934 r. w sprawie zmiany ustawy o spółdzielniach. – S. 635–641.

19. Баранавіцкая малачарня: да гісторыі каапэратыўнага руху ў Заходняй Беларусі і беларуска-польскіх дачыненьняў. Інтэрв'ю зь Пятром Орсам // Беларус. – 1993. – № 400. – С. 7.

20. Малачарскае Таварыства ў Баранавічах зьліквідавана // Самапомач. – 1936. – № 12. – С. 86.



***Radziuk A.* History of «Milk Partnership» in Baranovichi (1932–1936)**

In this article for the first time we investigate basic stages of development and activity of «Milk partnership» in Baranovichi. On the basis of archival documents, analysis of organization members' memories and information from periodicals of the 1930s we give the description of fundamental directions of economic life of partnership and conditions of its existence. Also we give brief analysis of the development state of milk cooperation on the territory of West Belarus and the characteristics of legislative activity of «Milk partnership» in Baranovichi.


Рукапіс паступіў у рэдкалегію 10.04.2012